ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
20.10.2020 № 275

**Вучэбная праграма факультатыўных заняткаў**
**«Асновы этналогіі і фальклярыстыкі»**
для X–XI класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць
адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная вучэбная праграма факультатыўных заняткаў «Асновы этналогіі і фальклярыстыкі» (далей – вучэбная праграма) прызначана для вучняў X–XI класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі.

2. Дадзеная вучэбная праграма разлічана на 70 гадзін (35 гадзін у кожным класе, 1 гадзіна на тыдзень).

3. Мэта – вывучэнне асноў этналогіі і фальклярыстыкі беларусаў.

4. Задачы:

набыццё ведаў пра пачаткі гістарыяграфіі этналогіі і фальклярыстыкі, іх асноўныя паняцці як навуковых дысцыплін, этнагенезе і этнічнай свядомасці беларусаў, іх Бацькаўшчыне, гісторыка-этнаграфічных рэгіёнах, этнічным складзе насельніцтва Беларусі і беларусах замежжа;

тэарэтычнае і практычнае вывучэнне свайго раёна (фальклорна-этнаграфічны аспект), практычнае прымяненне атрыманых ведаў на практыцы ў населеных пунктах раёна, знаёмства з асновамі працы этнолага і фальклярыста;

прывіццё любові да свайго краю, яго багатай гістарычнай спадчыны і культурных здабыткаў, выхаванне высокіх грамадзянскіх пачуццяў;

падрыхтоўка выпускнікоў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі да асэнсаванага выбару будучай спецыяльнасці, азнаямленне з патрабаваннямі да прафесіі этнографа і фальклярыста, раскрыццё прывабнасці прадстаўленых прафесій.

5. Формы і метады навучання і выхавання рэкамендаваны з улікам узроставых асаблівасцей вучняў X–XI класаў, змястоўнага і працэсуальнага кампанентаў вучэбнага матэрыялу. Віды практычных заняткаў для ўзору, метады і формы навучання педагог плануе сам, зыходзячы з канкрэтных магчымасцей. Асаблівую ўвагу рэкамендуецца звярнуць на заключныя заняткі, якія павінны стаць святам, дэманстрацыяй ведаў і ўменняў вучняў. Рэкамендуецца правесці канферэнцыю вучнёўскіх работ, на якой яны будуць абаронены.

6. Асноўныя патрабаванні да вынікаў засваення зместу вучэбнага матэрыялу выяўляюцца ў тым, што ў вучняў будуць сфарміраваны:

6.1. уяўленне аб асноўных накірунках развіцця гістарыяграфіі этналогіі і фальклярыстыкі, іх асобных паняццях як навуковых дысцыплінах, пра этнагенез і этнічную свядомасць;

6.2. веды:

аб асноўных характэрных рыс гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі, этнічным складзе насельніцтва Беларусі і накірунках эміграцыі беларусаў замежжа;

гістарычнага развіцця сваёй малой радзімы (горада, раёна), яго культурныя традыцыі, быт, асаблівасці фальклорнай спадчыны;

аб патрабаваннях да прафесіі этнографа і фалькларыста і ў якіх установах можна набыць спецыяльнасці;

6.3. уменні:

арыентавацца ў асноўных тэарэтычных пытаннях курса, абгрунтавана і лагічна выказаць свае думкі пра літаратурныя навінкі фальклорна-этнаграфічнага цыкла дысцыплін і этна-сацыяльных працэсах развіцця народаў Беларусі;

рабіць палявыя фальклорна-этнаграфічныя запісы і збор экспанатаў для краязнаўчага музея, іх пашпартызацыю, прасцейшую сістэматызацыю і вывады;

адрозніць па характэрных асаблівасцях матэрыяльную і духоўную культуру свайго раёна ад іншых гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў;

выконваць два-тры фальклорныя творы, арганізоўваць народную гульню, кампетэнтна ўдзельнічаць у правядзенні свята па народных традыцыях.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

X клас (35 гадзін)

Тэма 1. Уводзіны (2 гадзіны)

Паняцці «этнаграфія» і «этналогія». Накірункі этнаграфічнай навукі. Сувязь этнаграфіі з сумежнымі дысцыплінамі (гісторыя, археалогія, антрапалогія, этнагеаграфія, дэмаграфія, этнапсіхалогія, рэлігіязнаўства, калекцыяніраванне, нумізматыка, музеязнаўства, мастацтвазнаўства, фалькларыстыка, краязнаўства). Спецыфіка фалькларыстыкі і агульныя пытанні вывучэння.

Задачы курса і вызначэнне асноўных накірункаў працы.

Практычныя заняткі:

маляванне схемы сувязяў этналогіі з сумежнымі навукамі;

аповед вучняў пра адну з сумежных дысцыплін, іх выбітных прадстаўнікоў і яе сувязі з этналогіяй.

Тэма 2. Асноўныя паняцці ў этналогіі і фалькларыстыцы (2 гадзіны)

Рысы народа-этнаса: мова, культура, тэрыторыя, дзяржава, сацыяльная структура, рэгіянальныя асаблівасці. Племя. Народнасць. Нацыя.

Этнічная самасвядомасць. Гістарычная памяць. Менталітэт і этнічная псіхалогія.

Этнічныя працэсы. Міграцыя. Інтэграцыя. Кансалідацыя. Асіміляцыя. Міксацыя. Урбанізацыя. Генацыд. Адраджэнне.

Народная творчасць. Вусная народная творчасць. Народная паэтычная творчасць. Фальклор, яго паняцце ў розных краінах Еўропы. Фальклор аўтэнтычны.

Агульныя паняцці. Традыцыйнасць. Традыцыйная народная культура. Рытуал. Звычаі. Абрады і іх віды. Аказіянальныя і спецыялізаваныя абрады і звычаі.

Нацыянальная і рэгіянальная спецыфіка беларускай народнай творчасці.

Практычныя заняткі:

складанне табліц, галаваломак, рэбусаў з выкарыстаннем тэрміналогіі па этналогіі і фалькларыстыцы;

семінар па вызначаных настаўнікам пытаннях двух апошніх тэм.

Тэма 3. Цікавыя старонкі з гісторыі этнаграфіі і фалькларыстыкі (3 гадзіны)

Лекцыя (з элементамі займальнасці) пра найбольш цікавыя старонкі і асноўныя тэндэнцыі развіцця этнаграфіі і фалькларыстыкі, якія сфарміраваліся як асобныя

дысцыпліны да сярэдзіны XIX стагоддзя, іх кароткую гістарыяграфію. Першыя звесткі пра быт народа, яго фальклор з летапісаў і старажытнай літаратуры.

Першыя працы ў галіне беларускай этнаграфіі і фалькларыстыкі. З.Даленга-Хадакоўскі. Фалькларыстыка першай паловы XIX ст. Польскія і рускія даследчыкі пра беларускую вусную народную творчасць. А.Міцкевіч, Я.Баршчэўскі, Я.Чачот, П.Гільтэбрант, П.Бяссонаў. Фальклорна-этнаграфічныя працы П.Шпілеўскага, П.Шэйна, М.Нікіфароўскага, Е.Раманава, У.Дабравольскага, Я.Карскага, М.Федароўскага, М.Доўнар-Запольскага, Ч.Пяткевіча, К.Машынскага, М.Янчука, А.Багдановіча, А.Сержпутоўскага, І.Сербава.

Развіццё фалькларыстыкі і этналогіі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. З.Бядуля, М.Гарэцкі, Р.Шырма, Г.Цітовіч. Навуковая і збіральніцкая дзейнасць Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, вышэйшыя навучальныя ўстановы. Працы В.Бандарчыка, М.Пілiпенкі, А.Лакоткі, В.Цітова, А.Курыловіч, Н.Гілевіча, К.Кабашнікава, А.Фядосіка, А.Ліса, І.Цішчанкі, Г.Барташэвіч, Л.Салавей, А.Гурскага, У.Васілевіча, А.Ненадаўца, В.Новак. Музыказнаўчы і іншыя аспекты беларускага фальклору. Вобразы народазнаўцаў у творах мастацкай літаратуры: фалькларыст Андрэй Беларэцкі ў аповесці У.Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха».

Практычныя заняткі:

падрыхтоўка паведамленняў пра цікавыя старонкі жыцця і дзейнасці беларускіх фалькларыстаў і этнографаў (З.Даленга-Хадакоўскі, К.Машынскі, П.Шпілеўскі, А.Багдановіч, Р.Шырма);

выкарыстанне фальклору ў творчасці беларускіх пісьменнікаў;

сустрэча з фалькларыстам, этнографам.

Тэма 4. Народы свету (3 гадзіны)

Класіфікацыя народаў і моў (сем'і і групы). Паняцце пра расы.

Этналогія еўрапейскіх народаў. Гістарычныя лёсы. Грамадскі лад, традыцыйная культура, мова, нацыянальная сімволіка.

Гісторыя славянства. Славяне ўсходнія (рускія, украінцы, беларусы), заходнія (палякі, чэхі, славакі, лужычане) і паўднёвыя (балгары, македонцы, славенцы, сербы, харваты). Нацыянальная сімволіка.

Агульнафальклорныя з'явы ў культуры славянскіх і еўрапейскіх народаў.

Практычныя заняткі: праца з картамі свету, Еўропы.

Тэма 5. Этнагенез беларусаў (2 гадзіны)

Этнагенез – працэс фарміравання этнічнай супольнасці. Этнічная прыналежнасць старажытнага насельніцтва Беларусі (I тысячагоддзе да нашай эры – V стагоддзе нашай эры). Неўры, венеды, будзіны, пеўкіны, бастарны.

Рассяленне славянскіх плямёнаў. Пытанне аб прарадзіме славян. Узаемадачыненні з балтамі. Крывічы, дрыгавічы, радзімічы, валыняне, яцвягі, літва. Першыя княствы – Полацкае, Тураўскае, Смаленскае. Стасункі з Кіевам. Польская і руская канцэпцыі паходжання беларусаў. Ці была старажытнаруская народнасць?

Тэма 6. Этнічная свядомасць (3 гадзіны)

Гістарычнае фарміраванне ўсведамлення сваёй прынадлежнасці да пэўнага народа (этнаса).

Паходжанне назваў «Літва» і «Белая Русь». Утварэнне ў 1230-х гадах Вялікага княства Літоўскага (далей – ВКЛ), Рускага, Жамойцкага. Этнонімы-саманазвы («рускія», «літвіны», «літвіны рускага роду», «літвіны рускай веры», «літвіны-беларусцы», «літоўскія беларусы», «беларусы»). Крыніцы XIII ст. пра «Белую Русь» і яе сэнсавае значэнне. Гістарычнае ўсталяванне назвы «Белая Русь» на землях ВКЛ.

Дзяржаўная мова і сродак зносін паміж прадстаўнікамі розных народаў у ВКЛ. Замацаванне роднай мовы карэннага насельніцтва ў Статуце 1566 года. Скасаванне дзяржаўнасці мовы ў 1699 года.

Характэрныя рысы беларускай мовы (XIV–XV стагоддзі): «дзеканне», «цеканне», «аканне», цвёрдасць гукаў «р» і «ч». Фарміраванне беларускай нацыі ў канцы XVIII – палове XIX стагоддзяў.

Сумяшчэнне рэлігійнай і этнічнай свядомасці як важкі фактар складання народнасці. Распаўсюджанне на беларускіх землях праваслаўя (X–XVI стагоддзі), каталіцтва (з 1385 года), пратэстантызма (з XVI стагоддзя), уніяцтва (з 1596 года). Пануючы стан грэка-каталіцкага веравызнання ў XVIII стагоддзі.

Лёс беларускай мовы. Прыцясненне расійскім царызмам. Роля акадэмічнай канферэнцыі па рэформе беларускага правапісу і азбукі 1926 года. Пастанова Савета Народных Камісараў Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі «Аб зменах і спрашчэннях беларускага правапісу» (1933 год). Пытанні дзяржаўнасці беларускай мовы ў незалежнай Беларусі.

Практычныя заняткі:

правядзенне конкурса на лепшага знаўцу роднай мовы;

выкананне вершаў пра мову;

арганізацыя дыскусіі на адну з тэм «Чаму беларусы саромяцца размаўляць па-беларуску на вуліцы?», «Што значыць – быць беларусам?», «Што такое нацыянальная самасвядомасць і каму яна патрэбна?».

Тэма 7. Этнічная тэрыторыя (Бацькаўшчына) (1 гадзіна)

Навуковыя фактары вызначэння этнічных межаў. Беларусь на гістарычных картах. Этнаграфічныя карты (1863 года, 1875 года, 1903 года, 1918 года).

Паняцце этнічнай і дзяржаўнай тэрыторый. Абвяшчэнне беларускіх зямель паводле дакументаў Беларускай Народнай Рэспублікі (1918 год). Дзяржаўныя межы Беларусі пры Літоўска-Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы (1920 год), паводле Рыжскага мірнага дагавору (1921 год), узбуйненне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (1924 год, 1926 год), уз’яднанне Заходняй і Усходняй Беларусі (1939 год), Сталінскія «падарункі» адносна Вільні, Віленскага краю (кастрычнік 1939 года) і Беласточчыны (жнівень 1945 года).

Тэма 8. Гісторыка-этнаграфічныя рэгіёны (2 гадзіны)

Комплекс этнакультурных прыкмет рэгіёна. Кароткая характарыстыка матэрыяльнай і духоўнай культуры шасці рэгіёнаў Беларусі: Падзвінне (Паазер’е), Падняпроўе, Цэнтральная Беларусь, Панямонне, Усходняе і Заходняе Палессе.

Тэма 9. Раёназнаўства (гісторыка-этнаграфічнае вывучэнне свайго раёна). Фальклорна-этнаграфічная экспедыцыя (17 гадзін)

Гісторыя і народная спадчына свайго раёна. Матэрыяльная культура і традыцыйныя заняткі жыхароў у мінулым і сучасным. Асаблівасці жылля: дваровыя забудовы, інтэр’ер. Будаўнічая тэхніка і звычаі ў народным дойлідстве. Традыцыйная гаспадарчая дзейнасць: земляробства, жывёлагадоўля, бортніцтва (пчалаводства), паляўніцтва, рыбалоўства, збіральніцтва. Інвентар, прылады працы. Транспартныя сродкі. Традыцыйныя стравы і напоі. Рэчы ўжытку. Народнае адзенне. Вышыўка. Народныя промыслы і рамёствы. Ткацтва: кросны і іншае начынне. Мыццё бялізны. Апрацоўка дрэва. Бандарства. Пляценне. Музеі, выставы, конкурсы.

XI клас (35 гадзін)

Тэма 1. Раёназнаўства (гісторыка-этнаграфічнае вывучэнне свайго раёна). Фальклорна-этнаграфічная экспедыцыя (19 гадзін)

Фальклорныя традыцыі. Асаблівасці мовы. З гісторыі фальклорна-этнаграфічнага вывучэння краю. Адлюстраванне народнай спадчыны раёна ў кнігах «Беларуская народная творчасць», «Беларускі фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры», «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў», «Назвы населеных пунктаў паводле

легенд і паданняў», «Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка гарадоў і раёнаў Беларусі», «Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі», асобных зборніках. Міфалогія, замовы. Каляндарнае кола народных свят, прысвяткаў, звычаяў. Паэзія пораў года. Сямейна-абрадавая творчасць. Пазаабрадавая паэзія. Празаічныя творы. Малыя жанры фальклору. Гульні, карагоды і танцы.

Практычныя заняткі:

складанне плана этнаграфічна-фальклорнага вывучэння свайго раёна;

наведванне музея;

збор экспанатаў для музея ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі, афармленне пашпарту экспаната;

стварэнне тэматычнага альбома;

знаёмства з тэхнічнай апаратурай этнографа і фалькларыста (фотаапарат, магнітафон, дыктафон, відэаакамера);

запіс фальклорных твораў;

вывучэнне і выкананне запісаных песень;

паказ народных свят, абрадаў, карагодаў, танцаў, гульняў;

правядзенне спаборніцтваў па народных гульнях;

падрыхтоўка тэматычных рэфератаў;

правядзенне фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі;

падрыхтоўка допісу ў газету.

Тэмы 2–3. Этнаграфія сумежных рэгіенаў. Беларусы замежжа (дыяспара) (6 гадзін)

Прычыны эміграцыі. Беларуская эміграцыя перыяду ВКЛ. Уклад суайчыннікаў у культуру іншых дзяржаў (Ф.Скарына, І.Капіевіч, І.Фёдараў, П.Мсціславец, С.Полацкі). Літоўскія (беларускія) князі і княгіні ў далёкіх землях.

Лёс палонных-эмігрантаў. Роля беларусаў у развіцці культуры Расіі, Польшчы. Палітычная міграцыя (Т.Касцюшка, М.Агінскі, І.Дамейка, І.Чэрскі).

Палітычная і эканамічная эміграцыя XIX–XX стагоддзі Тры хвалі масавай эміграцыі.

Беларусы ў Расіі, Украіне, Карэліі, Казахстана, Прыбалтыцы, Польшчы, Чэхіі, Германіі, Аўстрыі, Англіі, Канадзе, Злучаных Штатах Амерыкі, Аўстраліі і іншых краінах свету. Вядомыя дзеячы эміграцыі. Грамадска-культурныя аб’яднанні і навукова-асветныя цэнтры. Дзейнасць культурна-асветніцкага таварыства «Бацькаўшчына».

Практычныя заняткі:

праца з картамі;

падрыхтоўка рэфератаў пра вядомых дзеячаў замежжа;

складанне характарыстыкі сумежных рэгіёнаў;

семінар па вызначаных настаўнікам пытаннях.

Тэма 4. Этнічны склад насельніцтва Беларусі (3 гадзіны)

Агульная статыстыка этнічнага складу насельніцтва згодна яго перапісаў. Уплыў беларускай культуры на культуру прадстаўнікоў этнічных меншасцей.

Рускія. Шляхі міграцыі рускіх (вайна, шлюбы, бегства). Стараверы. Палітыка русіфікацыі Беларусі ў час царызму і савецкі перыяд.

Палякі. Вынікі уніі ВКЛ і Польшчы. Роля каталіцкай царквы. Становішча палякаў на Беларусі пасля 1863 года. Рассяленне палякаў на тэрыторыі нашага краю ў канцы XIX–пачатку XX стагоддзяў, у 1920–1939 гадах. Развіццё польскай асветы і культуры на Беларусі.

Украінцы. Этнакультурныя стасункі ўкраінцаў і беларусаў. Казацтва, Дняпро, Палессе – агульнасць лёсаў і падзей.

Літоўцы. Удзел балцкіх плямёнаў у этнагенезе беларусаў. Міграцыя на тэрыторыі ВКЛ, Паўночна-Заходнім краі. Нацыянальныя асяродкі і арганізацыі літоўцаў на Беларусі.

Яўрэі. Гісторыя і традыцыйная культура яўрэйскага народа. Іудаізм. Талмуд. Сінагогі. Іміграцыя ў Беларусь. Духоўная і матэрыяльная культура яўрэяў. Генацыд у час вайны.

Татары. Першыя пасяленні на Беларусі. Служба татар у ВКЛ. Традыцыйная народная культура і рэлігія. Мячэці. Кітабы. Хрысціянізацыя і беларусізацыя (асіміляцыя) татар.

Цыганы. З'яўленне цыганскіх табараў у ВКЛ у XV стагоддзі. Традыцыйныя заняткі і быт. Вандроўны лад жыцця.

Практычныя заняткі: семінар па вызначаных настаўнікам пытаннях.

Тэма 5. Спецыяльнасці этнографа (этнолага) і фалькларыста (4 гадзіны)

Патрабаванні да ведаў па гістарычнай спецыяльнасці «Этналогія». Гістарычныя факультэты (Беларускі Дзяржаўны Універсітэт, установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка» (далей – БДПУ), абласных цэнтрах). Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы (далей – ІМЭФ), Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Аддзел этналогіі.

Філалагічная спецыяльнасць «Фалькларыстыка». Навучанне на філалагічных факультэтах універсітэтаў Беларусі (І семестр). Спецыяльнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў». Факультэт традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва (спецыяльнасці і спецыялізацыі «Народная творчасць. Фальклор», «Рэжысура. Народныя абрады і святы», «Харэаграфічнае мастацтва. Народны танец»). Спецыяльнасці БДПУ. Факультэт народнай культуры. Кафедра этналогіі і фалькларыстыкі. Спецыяльнасці «Сусветная і айчынная культура. Фальклор», «Сусветная і айчынная культура. Рытміка. Харэаграфія». Аддзелы фальклору і параўнальнага вывучэння вуснай народнай творчасці славян ІМЭФ.

Практычныя заняткі: правядзенне дыспута, гутаркі ці іншага прафарыентацыйнага мерапрыемства на адну з тэм: «Што значыць быць этнографам і фалькларыстам», «Хачу быць фалькларыстам, няхай мяне навучаць», «Што неабходна ведаць і умець, каб стаць фалькларыстам і этнолагам?».

Тэма 14. Канферэнцыя (3 гадзіны)

Абарона вучнёўскіх работ, рэфератаў